Беларускі фальклор: Энцыклапедыя: У 2 т. Т. 2 / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2006. – С. 316

**ПАЦЯГ** – групавая пазаабрадавая гульня. Адносіцца да гульняў з элементамі барацьбы і інш. сілавымі прыёмамі. Праводзілі па прынцыпе перацягвання каната на адкрытай пляцоўцы ці ў хатах на вячорках. Звычайна гуляла 8-20 чалавек, якія дзяліліся на 2 роўныя па сіле і колькасці гульцоў каманды і станавіліся ў 2 шарэнгі па адной лініі. Узначальвалі каманды мацнейшыя гульцы, т. зв. "завадныя", да якіх сагнутымі ў локцях рукамі чапляліся астатнія ўдзельнікі. "Завадныя тым самым спосабам бралі адзін аднаго пад руку. Часам паміж камандамі на зямлю ці на падлогу клалі невялікі прадмет – "мету" ці праводзілі ўмоўную мяжу. Па сігнале кожная група ўдзельнікаў цягнула ў свой бок каманду саперніка, імкнучыся разарваць ланцуг праціўніка або перацягнуць яго праз мяжу.

*Літ:*. Вількін Я.Р. Беларускія народныя гульні. Мн., 1996; Лабачэўская К.Л. Беларускія народныя гульні. Мн., 1990; Гульні, забавы, ігрышчы. Мн., 2000.

*А.В.Дрыгін*

Репозиторий ВГУ